Мужныя і бясстрашныя

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, выкарыстаны фота catholic.by
08.07.2018 00:00



Да 75-годдзя смерці бласлаўлёных мучанікаў II Сусветнай вайны II Сусветная вайна (1939–1945 гады) адбілася крывавай плямай у гісторыі чалавецтва. Гэта быў найбуйнейшы ўзброены канфлікт, дзеянні якога праходзілі на тэрыторыі 40-ка краін свету. Паводле розных ацэнак, за час II Сусветнай вайны загінула ад 50-ці да 80-ці мільёнаў чалавек. Сярод іх – бласлаўлёныя мучанікі, якія свядома і дабравольна ішлі на смерць, каб ураторваць іншых людзей.

Дайце ружанец...

За гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі гітлераўцы правялі больш за 140 карных аперацый. Фашысты палілі гарады і вёскі, расстрэльвалі мірнае насельніцтва, вывозілі жыхароў на прымусовыя працы ці на медыцынскія эксперыменты ў лагеры смерці. На думку гісторыкаў, страты на тэрыторыі Беларусі аказаліся нашмат большыя, чым у якой-небудзь іншай краіне свету. За час вайны тут загінуў кожны 3-ці.

У іх шэрагу стаяць бласлаўлёныя мучанікі, якія акрапілі сваёй крывёю тутэйшыя землі. Каталіцкі Касцёл беатыфікаваў іх у 1999–2000 гадах. Мясцовыя вернікі горача звяртаюцца праз іх да Бога, верачы ў моц заступніцтва. †



У 1943 годзе каля Навумавічаў, што на Гродзеншчыне, нямецкімі акупантамі былі жорстка расстраляны жыхары Гродна і Ліпска. Такім чынам гітлераўцы вырашылі адпомсціць за забіццё партызанамі нямецкага паліцая. Папярэдне былі складзены спісы, адбываліся масавыя арышты. У лік арыштаваных трапіла таксама сужэнства Станіслава і Ганны Бярнацкіх, якое чакала нараджэння дзіцяці. Мар’яна, маці Станіслава, з плачам

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, выкарыстаны фота catholic.by
08.07.2018 00:00

кідалася ў ногі нямецкаму салдату і прасіла забраць яе замест цяжарнай нявесткі.

Пасля непрацяглага побыту ў гродзенскай вязніцы маці разам з сынам і іншымі арыштаванымі вывезлі на фарты каля Навумавічаў, дзе 13 ліпеня 1943 года расстралялі. Вядома, што чакаючы пакарання, жанчына прасіла толькі аб адным: каб ёй далі ружанец.

Ганна Бярнацкая нарадзіла дачку. Сёння праўнук Мар'яны Бярнацкай прыязджае на месца спачыну выратавальніцы роду. Штогод у ліпені туды вырушае пешая пілігрымка з Гродна.

У ахвяру за тых, у каго Есць сем'і



Шмат праблем гарнізону акупантаў падчас вайны ствараліпартызанскія вылазкі. Узлаваныя гітлераўцы вырашылі спагнаць свой гнеў на мірных жыхарах Навагрудка. 18 ліпеня 1943 года яны арыштавалі каля 120-ці чалавек (па адных звестках, у асноўным бацькаў сямей, па іншых – жанчын і дзяцей). Родныя вязняў ішлі па суцяшэнне ў касцёл. Сёстры назарэтанкі, кляштар якіх знаходзіўся ў горадзе, горача маліліся аб выратаванні ўсіх і кожнага паасобку. Хадзілі чуткі, што дадому арыштаваныя жывымі не вернуцца. У сценах святыні манахіні прынялі для сябе нялёгкае рашэнне.

Настаяцельніца кляштара назарэтанак с. Марыя Стэла звярнулася да нямецкіх улад з просьбай адпусціць арыштаваных, замяніўшы іх на сясцёр: "Мой Божа, калі патрэбна ахвяра жыцця, няхай лепш нас расстраляюць, чым тых, у каго ёсць сём'і". Замест пакарання людзей адправілі на прымусовыя работы ў Германію, а сясцёр вызвалі ў гестапа. Манахіні разумелі, што ідуць на смерць.

Ноччу ў падвале камісарыята сёстры па чарзе маліліся, ляжалі крыжам на халоднай падлозе. На наступны дзень, на світанні 1 жніўня, 11 манахінь былі расстраляны ў лесе недалёка ад Навагрудка.

Пасля вайны адбылася эксгумацыя цел сясцёр. Яны былі пахаваны ў адзінай магіле каля навагрудскага фарнага касцёла, потым астанкі перазахавалі ў саркафагу ў капліцы святыні. Штогод у жніўні на месцы мучаніцкай смерці сясцёр пілігрымы ўшаноўваюць памяць манаскага подзвігу.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, выкарыстаны фота catholic.by
08.07.2018 00:00

Пастух там, дзе авечкі



Вялікая драма разгарнулася ў ліпені 1943 года на Міншчыне. Немцы распачалі аперацыю “Германн”, мэтай якой было знішчэнне партызанскага руху ў Налібоцкай пушчы. 19 ліпеня яны з’явіліся ў Пяршаях, каб адпомсціць мясцовым жыхарам за дапамогу партызанам, і выгналі каля 200 жыхароў з дамоў на вуліцу: жанчын – у адзін хлеў, мужчын – у другі. Фашысты мелі намер спаліць людзей жыўцом. Сярод іх былі таксама а. Ахілес Пухала і а. Герман Стэмпень, францысканцы.

За дзень да гэтага камендант паліцыі, які жыў у доме пробашча мясцовай парафіі і быў католікам, папярэдзіў айцоў, каб тыя схаваліся, абяцаў дапамагчы ім уцячы. Але святары адказалі, што не могуць пакінуць сваіх вернікаў: “Якія ж мы тады пастыры? Пастух павінен быць там, дзе авечкі”.

Айцы выйшлі да немцаў на перамовы, пасля чаго захопнікі выпусцілі людзей з хлявоў, выбраўшы сярод усіх каля сотні мужчын. Іх калонай пагналі ў бок Баравікоўшчыны. На чале калоны ішлі 2 святара. На месцы палонных сустрэлі немцы. Яны пачалі размову з айцамі. Праз нейкі час душпастыры супакоілі людзей, што тыя будуць жыць. Паблаславілі вернікаў – і больш іх ніхто ніколі не бачыў.

Арыштаваныя не ведалі, што здарылася са святарамі. Мужчын пагналі далей у бок Мінска, але, на дзіва, недалёка за вёскай вызвалілі. Яны вярнуліся дадому, а манахаў нямецкія афіцэры застрэлілі ў хляве на ўскраіне вёскі, пасля чаго будынак спалілі. Ёсць сведчанні, што перад смерцю святары перанеслі страшныя пакуты.

Памяць аб гэтым гераічным подзвігу жыве і сёння. Касцёл у Пяршаях мае статус санктуарыя бл. мучанікаў з ордэна францысканцаў а. Ахілеса Пухалы і а. Германа Стэмпеня. Штогод у ліпені сюды скіроўваюцца шматлікія пілігрымы, каб памаліцца ля рэліквій пакутнікаў.

З вернікамі да канца!

Мужныя і бясстрашныя

Аўтар: Ангеліна Пакачайла, выкарыстаны фота catholic.by
08.07.2018 00:00

